УДК 633.427 : 633.51 : 631.35 : 631.563

Ж. А. ГУРЫНОВІЧ

ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ МЕХАНІЗАВАНАЙ УБОРКІ ТУРНЭПСУ

Уборка — найбольш працаёмкая аперацыя ў тэхналогіі вырошчвання турнэпсу. З прычыны нязначных плошчаў пад пасевамі турнэпсу спецыяльных машын для яго ўборкі няма. За мяжой створаны рад машын, прызначаных для ўборкі караняплодаў [4, 5].

Шмат якія гаспадаркі на ўборцы караняплодаў выкарыстоўваюць тэхніку, прызначаную для ўборкі бульбы [1, 2, 7]. На механізацыю ўборкі караняплодаў уплываюць іх памер і маса [8, 9]. Аднак да гэтага часу адсутнічаюць даныя, якія характарызуюць магчымасць і якасць механізаванай уборкі, аграфізічную характарыстыку сартоў турнэпсу як аб'екта механізаванай уборкі. У сувязі з гэтым намі на эксперыментальнай базе «Жодзіна» БелНДІ земляробства і кармоў Смалявіцкага раёна праведзены даследаванні з мэтай вызначэння прыдатнасці і эфектыўнасці выкарыстання бульбаўборачных КТН-2 і ККУ-2А «Дружба» і караняплодаўборачнай (ККГ-1,4) машын на ўборцы караняплодаў турнэпсу.

Глеба доследнага ўчастка дзярнова-падзолістая лёгкасуглінкавая. Аграхімічныя паказчыкі ворнага пласта наступныя: колькасць гумусу (па Цюрыну) — 1,8—1,9 %, P_2O_5 (па Кірсанаву) — 18—28, K_2O (па Маславай) — 10,9—15,9 мг/100 г глебы, гідралітычная кіслотнасць (па Капену) — 1,12—1,21 мг-экв/100 г глебы, pH_{KCl} 6,52—6,7.

Уборка бацвіння праводзілася ратацыйнай касілкай КІР-1,5, якая косіць бацвінне турнэпсу, здрабняе яго і грузіць на транспарт, які ідзе побач.

Важным паказчыкам, ад якога залежала якасць зразання бацвіння, з'яўлялася вышыня размяшчэння караняплодаў над глебай. Даследаванні паказалі, што гэты паказчык у сартоў Маскоўскі з круглява-пляс-

Ураджайнасць і паказчыкі памераў турнэпсу ў паўкосных пасевах (1985—1986 гг.)

Паказчык	Сорт	
	Маскоўскі	Остэрзундомскі
Біялагічная ўраджайнасць, ц/га:		
агульная	430	422
караняплодаў	328	275
Адносіны масы бацвіння да масы караняплодаў	0,31	0,35
Колькасць раслін на 1 м²	21,1	23
Шырыня міжрадкоўяў, см	60	60
Сярэдняя вышыня раслін, см	59,4	58,2
Сярэдняя маса аднаго караняплоду, г	270,2	182,4
Сярэдняя вышыня чаранкоў пасля абразання бацвіння, см	4,6	8,2
Сярэдняя вышыня размяшчэння галоўкі караняплодаў над глебай, см:		
максімальная	8,4	12,6
мінімальная	7,5	7,1
Сярэдняя глыбіня залягання караняплода:		
поўная	8,5	12,9
тэхналагічная	3,4	6,2

катай формай караняплодаў і Остэрзундомскі з падоўжана-авальнай формай меў розную велічыню. Сорт Остэрзундомскі характарызаваўся найбольшай зменлівасцю вышыні караняплодаў адносна паверхні глебы ў параўнанні з сортам Маскоўскі. Так, напрыклад, калі ў сорту Маскоўскі вышыня галовак караняплодаў над паверхняй глебы складала ў сярэднім 7,9 см і знаходзілася ў межах 7,5—8,4 см, то ў сорту Остэрзундомскі — адпаведна 9,9 см і 7,1—12,6 см (табліца).

У нашых доследах вышыню рэжучага апарата КІР-1,5 вызначалі па найбольш высокіх раслінах, каб даўжыня чаранкоў пасля ўборкі лісця складала 2—5 см, як таго патрабуюць правілы захавання караняплодаў у буртах і сховішчах [3]. Пры такой арыентацыі на вышыню зрэзу колькасць пашкоджаных караняплодаў у пасевах памяншалася, аднак сярэдняя даўжыня пакінутых чаранкоў павялічвалася. Так, пасля праходу КІР-1,5 (рыс. 1, *а*, *б*) у пасевах з сортам Маскоўскі на адзін праход механічны ў сярэднім быў адзін пашкоджаны караняплод, з сортам Остэрзундомскі — тры караняплоды, а даўжыня чаранкоў складала адпаведна 4,6 і 8,2 см.

Паводле даных Г. Д. Пятрова [6], бацвіннеўборачная машына павінна ўбіраць не менш за 70% ураджаю бацвіння. У нашых доследах у залежнасці ад сорту ўбрана 78,6—88,4 %.

Такім чынам, па аграфізічных паказчыках караняплоды раяніраваных сартоў турнэпсу (Остэрзундомскі і Маскоўскі) прыдатныя для ме-



Рыс. 1. Выгляд турнэпсу пасля абразання лісця КІР-1,5 у паўкосных пасевах сартоў Остэрзундомскі (*а*) і Маскоўскі (*б*)